УДК 070(476)(091)«19»

# ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ НАПРАМКІ ДАСЛЕДАВАННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ДРУКУ Ў САВЕЦКІ ПЕРЫЯД: ДРУГАЯ ПАЛОВА ХХ ст.

***Н. А. ЗУБЧОНАК*** [1*]

[1*] *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Разглядаюцца асноўныя тэарэтыка-метадалагічныя напрамкі даследавання гісторыі беларускага друку ў журналісцкай навуцы савецкага перыяду. Праводзіцца агляд асноўных прац айчынных навукоўцаў па аналізе ўмоў станаўлення і функцыянавання выданняў, іх грамадска-палітычнай скіраванасці, ролі ў вырашэнні грамадска-палітычных і культурных задач, публіцыстычнага зместу матэрыялаў. Абгрунтоўваецца неабходнасць навуковага асэнсавання дзейнасці беларускіх друкаваных выданняў у розныя перыяды гісторыі з мэтай захавання агульначалавечых каштоўнасцей і дзяржаўных прыярытэтаў ва ўмовах сучаснай эпохі глабалізацыі.

***Ключавыя словы:*** гісторыя; друк; метадалогія; навука; журналістыка; публіцыстыка; палітыка; культура; літаратура; грамадства.

**Образец цитирования:**
Зубчонак НА. Тэарэтыка-метадалагічныя напрамкі даследавання гісторыі беларускага друку ў савецкі перыяд: другая палова ХХ ст. *Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика.* 2023;2:45–51.

**For citation:**
Zubchenok NA. Theoretical and methodological directions of research of the history of the Belarusian press in the Soviet period: second half of the 20th century. *Journal of the Belarusian State University. Journalism.* 2023;2:45–51. Belarusian.

**Автор:**
***Наталья Анатольевна Зубченок*** – кандидат филологических наук; доцент кафедры периодической печати и веб-журналистики факультета журналистики.

**Author:**
***Natalya A. Zubchenok***, PhD (philology); associate professor at the department of periodical press and web journalism, faculty of journalism.
*zubchon@bsu.by*

CC BY NC

# ТЕОРЕТИКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ НАПРАВЛЕНИЯ ИССЛЕДОВАНИЯ ИСТОРИИ БЕЛОРУССКОЙ ПЕЧАТИ В СОВЕТСКИЙ ПЕРИОД: ВТОРАЯ ПОЛОВИНА XX в.

***Н. А. ЗУБЧЕНОК***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Рассматриваются основные теоретико-методологические направления исследования истории белорусской печати в журналистской науке советского периода. Обозреваются основные работы отечественных ученых по анализу условий формирования и функционирования изданий, их общественно-политической направленности, роли в решении общественно-политических и культурных задач, публицистического содержания материалов. Обосновывается необходимость научного осмысления деятельности белорусских печатных изданий в разные периоды истории для сохранения общечеловеческих ценностей и государственных приоритетов в условиях современной эпохи глобализации.

***Ключевые слова:*** история; печать; методология; наука; журналистика; публицистика; политика; культура; литература; общество.

# THEORETICAL AND METHODOLOGICAL DIRECTIONS OF RESEARCH OF THE HISTORY OF THE BELARUSIAN PRESS IN THE SOVIET PERIOD: SECOND HALF OF THE 20$^{th}$ CENTURY

***N. A. ZUBCHENOK***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article deals with the main theoretical and methodological directions of studying the history of the Belarusian press in the journalism science of the Soviet period. A review of the main works of domestic scientists was carried out on the analysis of the conditions for the formation and functioning of publications, their socio-political orientation, their role in solving socio-political and cultural problems, the publicistic content of materials. Substantiates the need for scientific understanding of the activities of Belarusian printed publications in different periods of history in order to preserve universal values and state priorities in the modern era of globalisation.

***Keywords:*** history; press; methodology; science; journalism; publicism; politics; culture; literature; society.

## Уводзіны

Неабходнасць тэарэтычнага асэнсавання розных аспектаў функцыянавання журналістыкі абумоўлена шэрагам змен сацыяльнага, палітычнага, культуралагічнага і ўласна прафесійнага парадку. У сучасных умовах адбываецца кардынальная трансфармацыя самой прыроды журналісцкай дзейнасці. Па-першае, на гэта моцна ўздзейнічаюць тэхналагічныя працэсы, уключаныя ў журналісцкую практыку ў выніку глабалізацыі. Па-другое, за апошнія некалькі дзесяцігоддзяў змянілася грамадства, у прыватнасці яго сацыяльная структура, прыярытэты. Нарэшце, вельмі хутка трансфармуецца палітычная структура свету, што прыводзіць да з’яўлення новых цэнтраў і лідараў. Каштоўнасныя прыярытэты сучаснага грамадства таксама падвергліся татальнай мадэрнізацыі ў выніку аб’ектыўных прычын.

Адбываецца паступовая страта аўдыторыі традыцыйнымі сродкамі масавай інфармацыі. Новыя медыйныя платформы авалодваюць аўдыторыяй праз аптымальныя тэхнічныя спосабы ўзаемадзеяння з ёй. Дзякуючы сацыяльным сеткам у сучасных умовах фарміруецца грамадства з новай сацыяльнай свядомасцю. Супрацьстаяць гэтым тэндэнцыям дапаможа гістарычны вопыт, у тым ліку і навуковы. Яго асэнсаванне – задача не толькі навуковай, але і прафесійнай грамадскасці.

Такім чынам, глабалізацыя ўсіх сфер жыцця, поўная трансфармацыя сучаснай інфармацыйнай прасторы абсалютна заканамерна прыводзяць да асэнсавання таго, што кардынальных змен патрабуюць многія аспекты як прафесійнай, так і навукова-тэарэтычнай журналісцкай дзейнасці. Гістарычны аспект у дадзеным выпадку не з’яўляецца выключэннем. Значэнне гэтага фактару ў навуцы вельмі вялікае, паколькі ён дазваляе ствараць фундаментальную мадэль пэўнага грамадскага феномена ці тэарэтычнай катэгорыі, выпрацоўваць заканамернасці, праводзіць сістэмныя абагульненні.

## Асноўная частка

Гісторыя журналісцкай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі налічвае каля 500 гадоў (калі весці адлік ад пачатку распаўсюджвання першых газет-аднадзёнак у Вялікім Княстве Літоўскім). На аснове передавых сусветных традыцый назапашваўся вопыт перадачы інфармацыі, уплыву на грамадскую свядомасць. Навуковая школа развівалася таксама паступова, яна выпрацоўвала законы прафесійнай дзейнасці, абагульнення і сістэматызацыі гэтага вопыту.

Айчынная навуковая школа гісторыі журналістыкі фарміравалася ў савецкі перыяд. У 1950–80-я гг. была выпрацавана адзіная метадалогія даследавання дзейнасці СМІ ў гістарычным аспекце. Так, асноўнымі сталі наступныя навуковыя напрамкі: разгляд агульных пытанняў развіцця перыядычнага друку, вывучэнне грамадска-палітычнага кірунку часопісаў і газет як выразнікаў ідэалогіі пэўных грамадскіх груп, іх узаемаадносін, даследаванне працэсу развіцця часопісаў і газет як спецыяльных відаў друкаванай прадукцыі, арганізацыйнай структуры выданняў, вывучэнне і ацэнка дзейнасці вядомых рэдактараў, выдаўцоў і супрацоўнікаў перыядычнага друку, аналіз іх літаратурна-публіцыстычнага майстэрства і інш. На прыведзеных прынцыпах была пабудавана дзейнасць вядомых навуковых гістарычных школ у Мінску, Маскве, Ленінградзе, Кіеве і іншых гарадах СССР. На гэтай падставе ствараліся першыя падручнікі.

Навуковая канцэпцыя гісторыі беларускай журналістыкі пачынала фарміравацца ў адпаведнасці з ідэалагічнымі задачамі савецкай эпохі. Нягледзячы на дастаткова неадназначную ацэнку гэтага перыяду, нельга не заўважыць, што менавіта тады была выпрацавана грунтоўная метадалогія даследавання розных аспектаў журналісцкай дзейнасці, у прыватнасці гістарычнага. У першых навуковых працах па гісторыі беларускага друку створана аб’ектыўная карціна функцыянавання нацыянальнай сістэмы СМІ як асобнага сегмента ў агульнай структуры савецкай журналістыкі.

На фарміраванне акадэмічнай школы гісторыі беларускай журналістыкі ў другой палове XX ст., безумоўна, паўплываў працэс інтэнсіўнага развіцця прафесійнай адукацыі. Яшчэ да вайны, у 1932 г., у Мінску быў адкрыты Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава – першая вышэйшая навучальная ўстанова па падрыхтоўцы журналістаў. У 1944 г., пасля вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, пачаў працу факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, паколькі інтэнсіўнае развіццё СМІ на тэрыторыі БССР у пасляваенны перыяд патрабавала стварэння грунтоўнай тэарэтычнай асновы, агульнай канцэптуалізацыі палітычных, сацыяльных і культурных працэсаў. Факультэт журналістыкі БДУ і сёння застаецца асноўнай тэарэтыка-метадалагічнай базай журналісцкай адукацыі.

Асноўныя падыходы да вывучэння гісторыі, тэорыі і практыкі журналістыкі былі выкладзены ў працах першых беларускіх даследчыкаў, пачынальнікаў айчыннай навуковай школы. Да іх належаць М. С. Зярніцкі, Р. В. Булацкі, М. Я. Цікоцкі, І. І. Сачанка, А. Г. Слука, С. В. Говін, С. В. Марцэлеў і інш. Гістарычная панарама развіцця айчыннай журналістыкі ахапіла практычна ўсе этапы гэтага працэсу.

Навукоўцы падрыхтавалі шэраг грунтоўных прац па гісторыі дарэвалюцыйнага друку. У іх аснову пакладзены прынцып гістарызму, імкненне прадставіць дзейнасць асобных выданняў і іх аўтараў праз прызму найважнейшых грамадска-палітычных падзей часу.

Гісторыі дарэвалюцыйных выданняў прысвечаны навукова-гістарычны нарыс прафесара М. Я. Цікоцкага «З гісторыі беларускай журналістыкі XIX стагоддзя» (Мінск: БДУ, 1960). Дадзеная праца стала першым навуковым асэнсаваннем дзейнасці друку ў XIX ст. Як указвалася вышэй, даследаванне працэсу развіцця СМІ ў савецкі час адбывалася ў адпаведнасці з пэўнымі ідэалагічнымі задачамі, тым не менш многія тэарэтычныя палажэнні, сфармуляваныя навукоўцам, не толькі застаюцца актуальнымі, але і ў некаторым сэнсе набываюць новае значэнне. Гэта паказчык высокай ступені аб’ектывізму савецкай гістарычнай навукі.

Так, у прадмове да кнігі М. Я. Цікоцкі акрэсліў найважнейшую задачу гістарычнай навукі – абгрунтаванне «дыялектыка-матэрыялістычнага метаду ў высвятленні і ацэнцы канкрэтнага гістарычнага матэрыялу» [1, с. 4]. Аўтар вызначыў актуальную і на сённяшні дзень акалічнасць: «Без вывучэння гістарычнага працэсу, у тым ліку і культурнага працэсу, ва ўсёй яго шматграннасці нельга скласці глыбокага, поўнага і правільнага ўяўлення аб ім. Без вывучэння і ведання ўсіх тэндэнцый развіцця на кожным гістарычным этапе, усіх складанасцей, супярэчнасцей, канфліктаў і барацьбы паміж процілеглымі тэндэнцыямі нельга зразумець, як і чаму перамаглі самыя передавыя, прагрэсіўныя тэндэнцыі, як яны авалодвалі масамі і ўрэшце вызначылі паступальны рух чалавецтва, яго культуры» [1, с. 5]. У сувязі з гэтым выклікае цікавасць трактоўка многіх гістарычных падзей і фактаў, якія ў сучасных умовах гучаць у новых інтэрпрэтацыях. Навуковыя працы заснавальніка школы беларускай стылістыкі М. Я. Цікоцкага («Практычная стылістыка беларускай мовы» (Мінск: Нар. асвета, 1965); «Стылістыка публіцыстычных жанраў» (Мінск: Выш. шк., 1971); «Сугучнасць слоў жывых: нататкі па стылістыцы мастацкай літаратуры» (Мінск: БДУ, 1981) і інш.) створаны на гістарычным матэрыяле.

У даследаванні прадстаўлена аб’ектыўная гісторыя дзейнасці першых перыядычных выданняў на тэрыторыі Беларусі, такіх як афіцыйная газета Паўночна-Заходняга краю «Губернские ведомости», першае нелегальнае выданне на беларускай мове «Мужыцкая праўда», друкаваныя матэрыялы народнікаў,

першая прыватная гарадская газета на тэрыторыі Беларусі «Минский листок». Цікавым і пазнавальным з'яўляецца аналіз матэрыялаў беларускіх карэспандэнтаў у расійскіх дэмакратычных выданнях другой паловы XIX ст. «Современник», «День», «Колокол», «Искра».

Значным укладам у даследаванне гісторыі айчыннай журналістыкі сталі працы С. Х. Александровіча «Гісторыя і сучаснасць: літаратурна-крытычныя артыкулы» (Мінск: Беларусь, 1968); «Пуцявіны роднага слова: праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX – пачатку XX ст.» (Мінск: БДУ, 1971) і інш. Грунтоўнае вывучэнне ўмоў і асаблівасцей развіцця друку на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. дазваляе абсалютна аб'ектыўна сцвярджаць, што ў час палітычнага і эканамічнага крызісаў, жорсткага стаўлення расійскіх улад да Паўночна-Заходняга краю і яго насельніцтва, поўнай забароны ўжывання нацыянальнай мовы была створана і добра функцыянавала сістэма беларускага друку, прадстаўленая ўсімі асноўнымі тыпамі перыядычных выданняў (вялікімі газетамі, малой прэсай, вулічнымі лісткамі). У дадзеным кантэксце даследаванне С. Х. Александровіча іграе асаблівую ролю. У ім прыведзена інфармацыя аб дзейнасці такіх выданняў, як «Наша доля», «Наша ніва» і інш. У савецкі перыяд стаўленне да гэтых газет не было адназначным. У той жа час нельга забываць важныя для сённяшняга дня акалічнасці, звязаныя з дзейнасцю выданняў, якія напрамую паўплывалі на фарміраванне і развіццё беларускай нацыі і дзяржаўнасці. Па-першае, дзесяцігоддзе выхаду легальнай газеты на беларускай мове «Наша ніва» атаясамліваецца з асобным перыядам у айчыннай гісторыі. Па-другое, на старонках выдання выпрацоўваліся нормы літаратурнай мовы, фарміравалася школа нацыянальнай літаратуры і літаратурна-мастацкай крытыкі. Па-трэцяе, дзякуючы дзейнасці гэтай газеты завяршыўся працэс нацыянальна-культурнага адраджэння, была падрыхтавана аснова нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва і сфармулявана канцэпцыя беларускай нацыянальнай гісторыі (твор В. Ластоўскага «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» – першае навуковае асэнсаванне гісторыі краіны). Па сучасных крытэрыях «Наша ніва» – гэта прагрэсіўнае выдавецкае прадпрыемства, якое, акрамя самой газеты, выпускала шмат іншых друкаваных матэрыялаў: газету «Bielarus», календары, часопісы «Саха», «Лучынка», «Раніца», «Крапіва», альманах «Маладая Беларусь» і інш.

Даследаванне гісторыі беларускага друку ў працах С. Х. Александровіча праводзіцца ў кантэксце фарміравання і развіцця літаратурнага працэсу. Для свайго часу такі падыход быў цалкам навукова абгрунтаваны. Станаўленне сістэмы друку адбывалася на аснове літаратурна-публіцыстычнага вопыту. Для выданняў XVIII–XIX стст. характэрна прысутнасць вялікай колькасці пісьменнікаў у складзе рэдакцый. У савецкі час вучэбныя планы ў вышэйшых навучальных установах журналісцкага профілю нават уключалі дысцыпліну «Гісторыя журналістыкі і літаратуры». С. Х. Александровіч лічыў «грунтоўнае і ўсебаковае даследаванне гісторыі сувязей і ўзаемаадносін беларускай літаратуры і беларускага друку на працягу чатырох з паловай стагоддзяў адной з важных праблем станаўлення нацыянальнай культуры» [2, с. 3].

Нельга не адзначыць, што такі падыход да арганізацыі прафесійнай журналісцкай работы з'яўляецца даволі грунтоўным. Перыядычныя выданні XIX – пачатку XX ст. (неафіцыйныя часткі выданняў «Губернские ведомости», «Виленский вестник», «Епархиальные ведомости», газет «Минский листок», «Наша ніва») вызначаюцца глыбокай змястоўнасцю, тэматычнай і жанравай разнастайнасцю. Нават першыя газеты савецкага перыяду («Дзянніца», «Савецкая Беларусь», «Беларуская вёска» і інш.), у падрыхтоўцы якіх прымалі актыўны ўдзел беларускія літаратары (Цішка Гартны, Змітрок Бядуля, Янка Купала, Андрэй Александровіч і інш.), таксама па ўзроўню напісання матэрыялаў лічацца аднымі з лепшых і па некаторых крытэрыях (жанравая разнастайнасць, стылістычная арыгінальнасць, глыбіня раскрыцця тэмы) перавышаюць сучасныя СМІ.

Галоўнае месца ў даследаванні гісторыі айчыннага друку займала дзейнасць вядучых бальшавіцкіх газет. Для БССР такім выданнем стала газета «Звязда». Сёння гэта масавая грамадска-палітычная газета паспяхова функцыянуе на нацыянальным медыйным полі. На працягу стагоддзя менавіта праз яе фарміравалася нацыянальная прафесійная журналісцкая школа. Эфектыўная работа рэдакцыі ў розныя гістарычныя перыяды будавалася на аснове грунтоўнай стратэгіі, што адпавядае задачам грамадскага развіцця і ідэалам прафесійнай дзейнасці. Вывучэнне гісторыі станаўлення дадзенага выдання запатрабавана сучасным працэсам пераасэнсавання каштоўнасных арыенціраў, вопыту практычнай дзейнасці.

Першай спробай навуковага асэнсавання працэсу развіцця газеты стала манаграфія М. С. Зярніцкага «Газета "Звезда" ў барацьбе за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі» (Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, 1957). Дзейнасць рэдакцыі газеты «Звязда» разглядаецца аўтарам у кантэксце развіцця бальшавіцкага руху на тэрыторыі Беларусі. Па сутнасці, у выданні былі адлюстраваны найважнейшыя грамадска-палітычныя працэсы, апублікаваны галоўныя праграмныя дакументы савецкай улады. Акрамя таго, масавая бальшавіцкая газета арганізоўвала эфектыўную грамадска-палітычную работу рэдакцыі, забяспечвала высокую якасць газетных матэрыялаў, пры гэтым захоўвала і асэнсоўвала выдавецкі вопыт іншых бальшавіцкіх газет.

Наступным этапам даследавання газеты «Звязда» стала праца М. С. Зярніцкага «Белорусская советская печать в годы иностранной военной интервенции

и гражданской войны (1918–1920 гг.)» (Мінск: Выш. шк., 1963). Аўтар прадстаўляе дзейнасць газеты ў кантэксце фарміравання беларускай дзяржаўнасці, калі ў найскладанейшых грамадска-палітычных умовах барацьбы з нямецкімі і польскімі акупантамі фарміравалася новая ідэалогія, вызначаліся напрамкі развіцця дзяржавы. Так, менавіта газета «Звязда» надрукавала пастанову Прэзідыума Усерасійскага цэнтральнага выканаўчага камітэта «Аб прызнанні незалежнасці Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» і іншыя дакументы. Вышэйназваныя працы М. С. Зярніцкага па навуковым асэнсаванні і абагульненні вопыту першых гадоў дзейнасці рэдакцыі, аналізе зместу публікацый газеты маюць каштоўнасць і ў плане прадстаўлення факталагічнага матэрыялу, паколькі ў архівах і бібліятэках Беларусі на сённяшні дзень захоўваюцца не ўсе нумары выдання.

У навукова-публіцыстычным даследаванні «Газета “Звязда” ў гады Вялікай Айчыннай вайны (чэрвень 1941 – май 1945 гг.)» (Мінск: БДУ, 1970) М. Е. Дастанка прадставіў поўны спектр дзейнасці выдання: змест публіцыстыкі, жанравыя і стылістычныя асаблівасці матэрыялаў, спецыфіка арганізацыі працы ва ўмовах падполля. У гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі значным крокам стаў выпуск газеты «Звязда» як органа Мінскага гарадскога падпольнага камітэта КП(б)Б. У канцы 1942 г. на Любаншчыне ў зоне размяшчэння партызанскіх атрадаў быў наладжаны выпуск газеты «Звязда» як органа Цэнтральнага камітэта КП(б)Б і Мінскага абласнога падпольнага камітэта КП(б)Б. Выданне публікавала інфармацыю аб наступленні савецкіх войск і вызваленні тэрыторыі Беларусі ад акупантаў, заклікала народ да барацьбы з ворагам. У ліпені 1944 г. газета «Звязда» выйшла ў вызваленым Мінску як орган Цэнтральнага камітэта КП(б)Б, Савета народных камісараў БССР і Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Беларускі народ увекавечыў подзвіг выдаўцоў газеты. Так, рэдактар мінскага падпольнага выдання У. С. Амельянюк быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. У 1965 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР рэспубліканская газета «Звязда» была ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

У працах беларускіх навукоўцаў па гісторыі друку ў другой палове XX ст. аналізуюцца пэўныя групы выданняў. Сістэматызацыя прэсы ажыццяўлялася ў залежнасці ад профілю, тэматыкі выдання, яго мэтавай аўдыторыі, канкрэтных грамадска-палітычных і сацыякультурных задач і інш. Так, прафесар А. Г. Слука правёў грунтоўнае даследаванне маладзёжнай прэсы. Фарміраванню яе сістэмы ў гады станаўлення сацыялізму прысвечана манаграфія «Голос революционной молодежи (проблемы становления и развития молодежной печати Беларуси)» (Мінск: БДУ, 1978). Пасляваеннае развіццё маладзёжнага друку аналізуецца ў манаграфіі «Комсомольская строка: проблемы идейно-политического воспитания в молодежной печати Белоруссии» (Мінск: Універсітэцкае,1984). У прыведзеных працах даследавана гісторыя стварэння і функцыянавання газет і часопісаў для дзяцей і моладзі, вылучаны напрамкі іх дзейнасці па рэалізацыі задач піянерскага і камсамольскага руху, вырашэнні праблем грамадскага развіцця, актуалізацыі пытанняў адукацыі і патрыятычнага выхавання, фарміраванні асабістых якасцей. У няпросты час пераацэнкі каштоўнасцей, змены грамадскіх арыенціраў знаёмства з матэрыяламі гэтых манаграфій можа быць вельмі карысным. Сёння ў навуковым і прафесійным дыскурсе маладзёжных СМІ патрабуе перагляду іх функцыянальны змест, а таксама прынцыпы арганізацыі кантэнту.

У 1939 г. адбылася значная гістарычная падзея – далучэнне тэрыторый Заходняй Беларусі да БССР, аб’яднанне беларускага народа ў адной дзяржаве. У айчыннай навуцы асобна даследаваліся літаратура Заходняй Беларусі, яе гісторыя і, адпаведна, друк. Так, аналізу працэсаў стварэння і развіцця прэсы прысвечана манаграфія С. В. Говіна «Друк Заходняй Беларусі» (Мінск: БДУ, 1974). Гэта дзейнасць разглядаецца ў кантэксце барацьбы народа Заходняй Беларусі з буржуазна-памешчыцкай Польшчай за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

Аналіз публіцыстыкі пэўных гістарычных перыядаў займае значнае месца ў гісторыі беларускага друку. Зварот да публіцыстычных матэрыялаў выданняў стаў традыцыйным прыёмам у раскрыцці пытанняў па асобных кірунках і этапах развіцця друку. Публіцыстыка даследуецца ў названых навуковых працах М. С. Зярніцкага, М. Е. Дастанкі, А. Г. Слукі і інш. Так, бальшавіцкія выданні ў гады барацьбы з фашызмам сталі па-сапраўднаму магутнай сілай. У складаныя часы супрацiўлення інфармацыя мела выключнае значэнне, бо яна аб’ядноўвала народ для барацьбы з ворагам. Гісторыя друку перыяду Вялікай Айчыннай вайны прадстаўлена ў шматлікіх даследаваннях. У плане аналізу публіцыстычнай дзейнасці выданняў у гісторыі беларускага друку значнае месца належыць працы прафесара І. І. Сачанкі «Война и публицистика» (Мінск: Навука і тэхніка, 1980), якая ўяўляе сабой навукова-тэарэтычнае абагульненне публіцыстычнай дзейнасці праз актуалізацыю задач сучаснасці. У перыяд абвастрэння палітычнай сітуацыі значэнне публіцыстычнай творчасці ўзрастае, аб чым разважае аўтар у прадмове да кнігі. У выданні аналізуюцца мерапрыемствы савецкага ўрада па перабудове сістэмы друку для функцыянавання ў ваенных умовах, канкрэтызуюцца задачы рэдакцый па выпрацоўцы інфармацыйных стратэгій, якія ўключалі асвятленне найважнейшых ваенных падзей і поспехаў Чырвонай арміі і партызанскага руху, акрэсленне мер па супрацьстаянні фашысцкай ідэалогіі праз выкрыццё яе антычалавечнай сутнасці, барацьбу з варожай прапагандай і яе друкам. У гады Вялікай Айчыннай вайны актыўнымі супрацоўнікамі газет былі вядомыя беларускія пісьменнікі: Якуб Колас, Кузьма Чорны, Міхась Лынькоў, Кандрат Крапіва

і інш. Іх аўтарытэт і публіцыстычнае майстэрства сталі моцнай зброяй. Канкрэтна-гістарычную задачу публіцыстыкі І. І. Сачанка сфармуляваў так: «Усё ўзрастаючая роля антыфашысцкай публіцыстыкі ў жыцці грамадства патрабуе ад пісьменнікаў-публіцыстаў і журналістаў на сучасным узроўні даваць рашаючы адпор ідэалагічным дыверсіям імперыялізму, рашуча і аператыўна выкрываць тыя сілы, якія выступаюць у мантыях самазваных пракурораў гітлерызму, палітычных спекулянтаў гісторыі Другой сусветнай вайны» (пераклад наш. – *Н. З.*) [3, с. 269]. Сёння важнасць і значнасць дадзеных слоў становяцца як ніколі зразумелымі.

У даследаванні гістарычных аспектаў беларускага друку шмат месца займаюць працы, у якіх дзейнасць выданняў разглядаецца ў кантэксце пэўных рэалій савецкага часу. Адной з праяў грамадскага жыцця і прафесійнай журналісцкай дзейнасці стаў рабселькораўскі рух. Яго разгляду прысвечаны манаграфіі Р. В. Булацкага «Первые рабселькоры Белоруссии» (Мінск: Навука і тэхніка, 1969), а таксама В. І. Галь «Зарождение рабселькоровского движения в Белоруссии (доoктябрьский период)» (Мінск: Навука і тэхніка, 1977). Нельга не адзначыць, што развіццё рабселькараўскага руху для журналістыкі БССР мела выключнае значэнне. Пашырэнне сеткі пазаштатных карэспандэнтаў не толькі садзейнічала насычэнню выданняў цікавай інфармацыяй з розных рэгіёнаў рэспублікі, але і спрыяла актывізацыі палітычнага жыцця, уключэнню грамадства ў абмеркаванне і паступальнае вырашэнне многіх праблем. Такім чынам, асэнсаванне прафесійнага журналісцкага вопыту ажыццяўлялася ў самых розных напрамках, але абавязкова адпавядала рэаліям часу.

Даследчыкі гісторыі друку падрыхтавалі працы, у якіх дзейнасць прэсы разглядаецца ў кантэксце актуалізацыі і вырашэння пэўных грамадскіх задач. Да іх адносяцца публікацыі Р. В. Булацкага «Печать Белоруссии в период завершения социалистической реконструкции народного хозяйства республики (1933–1937)» (Мінск: БДУ, 1960), В. А. Пыжкова «Друк Беларусі ў барацьбе за выкананне гістарычных рашэнняў XXI з’езда КПСС» (Мінск: БДУ, 1960), С. В. Марцэлева «На путях строительства социализма: печать Белоруссии в 1926–1937 гг.» (Мінск, Беларусь, 1972), А. Ф. Мяснікова «Сацыялістычнае спаборніцтва і друк Беларусі: праблематыка выступленняў рэспубліканскіх газет сярэдзіны сямідзясятых гадоў» (Мінск: БДУ, 1980) і інш. Дарэчы, гэты метад даследавання актыўна рэалізуецца і сёння. Рэгулярна выдаюцца навуковыя працы, у якіх дзейнасць СМІ разглядаецца ў кантэксце грамадска-палітычнага і сацыякультурнага развіцця краіны.

У другой палове XX ст. гісторыкі друку пісалі працы абагульняючага характару: падручнікі, навукова-метадычныя дапаможнікі, манаграфіі. Яны прааналізавалі працэс развіцця друку на тэрыторыі Беларусі з моманту ўзнікнення першых выданняў да пэўнага часу. У 1979 г. падручнік Р. В. Булацкага, С. В. Говіна, І. І. Сачанкі «Гісторыя беларускай журналістыкі» быў выдадзены ў БДУ. У ім прадстаўлена гісторыя развіцця друку з XVIII па другую палову XX ст. Калектыў аўтараў кнігі быў удастоены Дзяржаўнай прэміі БССР. Другой значнай працай стала кніга С. В. Марцэлева «Печать Советской Белоруссии: исторический очерк» (Мінск: Беларусь, 1967). Акрамя працэсу развіцця савецкага друку, аўтар разглядае асаблівасці кнігавыдавецкай дзейнасці ў БССР.

## Заключэнне

Беларускія навукоўцы ў другой палове XX ст. апублікавалі вялікую колькасць прац па гісторыі друку, у якіх прадстаўлены асаблівасці яго функцыянавання на пэўных этапах, даследавана публіцыстычнае майстэрства асобных аўтараў і саміх выданняў, праведзены аналіз дзейнасці рэдакцый, вызначана роля газет і часопісаў у вырашэнні грамадска-палітычных і культурных задач.

Нягледзячы на гэта, абсалютна аб’ектыўна патрабуюць пераасэнсавання многія гістарычныя факты і працэсы. Беларусь мае вопыт незалежнага дэмакратычнага ладу, развіваецца ў рэчышчы сусветных сацыяльна-палітычных і культурных тэндэнцый. Беларускі народ стварае новую ідэалогію жыцця ў інфармацыйным грамадстве і грамадзянскай супольнасці. У сувязі з гэтым падыход да асэнсавання гісторыі развіцця журналісцкага працэсу павінен быць комплексным, сістэмным. Неабходна імкнуцца да паказу гісторыі медыя праз прызму іх узаемадзеяння з грамадскімі інстытутамі, прафесійнымі структурамі, органамі ўлады.

Трэба даследаваць гісторыю журналістыкі ў кантэксце фарміравання і развіцця беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай ідэалогіі. Менавіта гэты метадалагічны прынцып не быў рэалізаваны ў савецкай навуцы. Сучасныя падыходы да гістарычных даследаванняў, якія называюцца новай сацыяльнай гісторыяй, накіраваны на шматаспектнае вывучэнне асаблівасцей жыццядзейнасці грамадства на працягу вялікай гістарычнай эпохі.

Прадаўжаецца праца па стварэнні нацыянальнай гісторыі журналістыкі. За аснову мэтазгодна прыняць найважнейшыя перыяды ў фарміраванні беларускай дзяржаўнасці. Значным падмуркам у гэтым напрамку сталі работы прафесара А. Г. Слукі «Беларуская журналістыка» (Мінск: БДУ, 2003–2009), «Беларуская журналістыка» (Мінск: БДУ, 2011), манаграфіі па пытаннях фарміравання нацыянальнай ідэалогіі. Менавіта дзяржаўна-палітычны аспект у развіцці журналістыкі заўсёды з’яўляўся дамінуючым. У дачыненні да гісторыі беларускіх медыя асобае значэнне мае і нацыянальны фактар.

У XXI ст. журналістыка набыла рысы навукі. Па разнастайных аспектах вызначаны прадметы даследавання, сфарміравана метадалогія. Аднак без пераасэнсавання гісторыі нельга ўдасканаліць тэорыю. Сучасныя падыходы да вывучэння гісторыі медыя, новыя патрабаванні да яе канцэп туалізацыі як навуковай дысцыпліны будуць садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці прафесійнай журналісцкай дзейнасці.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Цікоцкі МЯ. *З гісторыі беларускай журналістыкі XIX стагоддзя*. Мінск: БДУ; 1960. 125 с.
2. Александровіч СХ. *Пуцявіны роднага слова: праблемы развіцця беларускай літаратуры і друку другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя*. Мінск: БДУ; 1971. 245 с.
3. Саченко ИИ. *Война и публицистика*. Булацкий ГВ, редактор. Минск: Наука и техника; 1980. 280 с.

## References

1. Cikocki MJa. *Z gistoryi belaruskaj zhurnalistyki XIX stagoddzia* [From the history of Belarusian journalism of the 19th century]. Minsk: Belarusian State University; 1960. 125 p. Belarusian.
2. Aleksandrovich SH. *Puciaviny rodnaga slova: prablemy razviccia belaruskaj litaratury i druku drugoj palovy XIX – pachatku XX stagoddzia* [Journeys of the native word: problems of the development of Belarusian literature and printing in the second half of the 19th – beginning of the 20th century]. Minsk: Belarusian State University; 1971. 245 p. Belarusian.
3. Sachenko II. *Voina i publitsistika* [War and journalism]. Bulatskii GV, editor. Minsk: Nauka i tekhnika; 1980. 280 p. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 05.07.2023.*
*Received by editorial board 05.07.2023.*